№ 14 (43) Нядзеля, 8-га траўня 1927 г. м. Вільня Год II.

Беларускае Слова

Выходзіць раз у тыдзень Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адраджэньне. — Тэрыторыяльная і культурна-нацыянальная аутаномія. — Зямля сялянам на падставе уласнасьці. — Шырок дэмократызм. — Барацьба з комунізмам. — Нацыянальная царква. — Краевая згода. — Далучэньне Усходняй Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
„ „ „ 3 „ 2 зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Ludwisarska 5 m. 2.
Рэдакцыя адчынена ад 12 — 2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам — 20 гр
„ сярод тэксту — 25 гр.
„ на апош. стар. — 10 гр.
за радок нонпарэля.

Сарвалося.

Процiў уселякага спадзеваньня, бальшавікі сваю стаўку ў Кітаі праігрываюць, ці правільней кажучы ўжо праігралі. Жоўтыя д'яблы не ў прыклад гнілой і гуманкай Эўропе знайшлі ў сабе даволі грамадзкай сьмеласьці прытарнаваць і да паноў комуністаў тыя спосабы барацьбы, на якія да гэтага часу мелі патэнт толькі паны комуністы; спачатку Чанг-Со-Лін, а потым і Чанг-Кай-Шэк, на ўсе спробы рэвалюцыйных комуністычных экспэрымэнтаў, за якімі распачаліся-бы масовыя акты тэррору „ў парадку рэвалюцыйнай неабходнасьці", пасьпяшылі папярэдзіць комуністаў і ў першы яшчэ раз за ўвесь час комунізму, застасаваўшы масовыя расстрэлы комуністаў. І трэба прызнаць, што расстрэліваць безбаронных ахвяраў, як гэта комуністы рабілі ў Расеі, аказалася многа лягчэй, як вясьці барацьбу на раўных пачатках. Гэткім чынам Кітай, сьпячы, паўдзікі, аказаўся нязьмерна больш жыцьцёвым, магутным пастаяць за сябе, чымся Эўропа, бо распачаўшыйся паход процiў комунізму, пры адначасным надзвычай моцным нацыянальным пад'ёме — прывядзе Кітай да нацыянальнай незалежнасьці, а разам з гэтым [illegible] яму дарогу на Далёкі Усход. І вось з тае прычыны, што комунізм пацярпеў гэткі страшэнны крах у Кітаі, трэба спадзявацца, што бальшавікі будуць прабаваць адыграцца ў другім мейсцы. Гдзе ж лепшае мейсца як у Эўропе ім знайсьці, гдзе можна найляпей займацца шантажам, ашуканствам. Каму можна ўціраць акуляры як не разьбітай, разьеднанай, безталковай Эўропе. Польшча-ж заўсёды была авангардам Эўропы, а разам з тым і бар'ерам Эўропы ад комуністычнага ўсходу. Дзеля гэтага трэба чакаць, што жорстка пабіты ў Кітаі 3-ці Інтэрнацыянал хочучы адыграцца пачне свае штучкі зноў на Захадзе, а перад усім у Польшчы.

А калі прыпомніць, што сваей падрыўной працы комуністы ў Польшчы і ранеі не прарывалі, робячы яе праз рожныя Грамады Н. П. Х. і іншыя партыі, дык мусім чакаць у хуткім часе ўзнаўленьня больш энэргічнай працы. З тое-ж прычыны, што Грамада разьбіта і не гледзючы на ўсе спробы падраўняць парадзеўшыя рады, зрабіць перагрупіроўку і г. д., гэта ёй не ўдаецца — трэба спадзявацца новых спосабаў комуністычнай працы, новых мэтадаў яе тутака ў Польшчы. Гэта павінны разумець і мы беларускія антыбальшавікі, а дзеля таго, каб дабіць гада і не даць яму аправіцца, патрэбна ўсе высілкі палажыць на пашырэньне нацыянальнай сьвядомасьці, на працу культурную і нарэшце на ахвярную, адкрытую барацьбу з уплывамі комуністычнай заразы сярод шырокіх беларускіх масаў. Тагды калі будзе праіграна бальшавіцкая стаўка ў нашай мягкацелай Эўропе — комунізм з трэскам згіне на ўсім Сьвеце.

Палітычны агляд.

Палітычная сытуацыя на Далёкім Усходзе застаецца пакуль нявыразнай. Ясна толькі адно, што бальшавізм пацярпеў у Кітаі поўнае паражэньне. Гэнэрал Шэк апанаваў апрача Нанкіна, дзе ён стварыў новы Урад, і Шанхая яшчэ Кантон. Гэткім чынам бальшавіцкі элемэнт у палуднёвым Кітаі зусім адсунуты ад марскога пабярэжжа ў глыбіню краю і адрэзаны ад вонкавага сьвета. Пасьля здрады гэн. Шэка ханькоўскі комуністычны Урад прапанаваў гэнэралу Фэнгу, які стаіць на чале мангольскай арміі, прыняць на сябе кіраўніцтва комуністычнымі сіламі процi Шанхая і Пэкіна. І можна было спадзявацца што ён згодзіцца на гэту прапазыку, маючы на увазе тое, што да гэтай пары ён быў пад уплывам Масквы, ад якой атрымліваў сталую грашовую запамогу, ваенны матэрыял і інструктароў. Але з зусім незразумелых повадаў гэн. Фэнг перайшоў на бок Шэка і пачаў біць комуністаў у Ханькоў, якія апынуліся ў бязвыхаднай сытуацыі, з Усхода іх б'е Шэк, з Захода — Фэнг, а з Поўначы — Чанг-Тсо-Лін. І можна было бы лічыць сытуацыю зусім выразнай, калі-б дайшлі да згоды між сабою Шэк з Чанг-Тсо-Лінам. Але на жаль гэтага пакуль яшчэ няма. Усе чуткі аб тым, што між Шэкам, стаячым на чале Нанкінскага Ураду і Чанг-Тсо-Лінам, стаячым на чале Пекінска-Маньджурскага [illegible] досягнута згода аказаліся неправідловымі. Між гэтымі дзьвума групамі ўзнавіліся ваенныя дзеяньні з пераменным шчасьцем. Другім неспрыяючым фактам зьяўляецца нявыразнае аднашэньне Шэка да Англіі, у той час як з Японіяй адносіны вельмі добрыя. Гэта дае магчымасьць Японіі пашырыць свае ўплывы і на палуднёвы Кітай.

І вось, калі бальшавікі аказаліся паложанымі на абедзьве лапаткі ў Кітаі, і сталі на беразі прорвы, ім працягнула рукі помачы Эўропа, тая самая Эўропа, для якой яны гатовяць пагібель. Трэба было чакаць, што за страты ў Азіі бальшавікі пастараюцца адыграцца ў Эўропе. Пад гэтым у поцетвару працавалі іх хаўрусьнічкі немцы, для якіх поўнае паражэньне бальшавікоў было-бы іх уласным паражэньнем. Што датычыць няўдачаў бальшавікоў у Кітаі, дык гэта на руку немцам дзеля таго, што дае ім большую магчымасьць скарыстаць іх у Эўрапэйскіх справах. Калі бальшавікі па вушы былі заняты кітайскаю справаю, дык на выпадак аружнага канфлікту ў Эўропе Нямеччына не магла лічыць на помач з боку Масквы. Дзеля гэтага Штрэзэман ужо даўно стараўся ўцягнуць бальшавікоў у Эўрапэйскую палітыку, каб узмацаваць сваю пазыцыю на жэнэўскім грунце. Колькі разоў падымалася пытаньне аб тым, каб прыцягнуць Радавую Расею да Лігі Народаў і канфэрэнцыі аб разаружэньні. Але бальшавікі дэманстратыўна байкатавалі Лігу Народаў і адмаўляліся ад удзелу ў якіх небудзь міжнародных канфэрэнцыях з таго повадУ, што яны адбываюцца выключна ў Швэйцарыі, з якою былі варожыя адносіны пасьля забойства Вароўскага. Але з пераменаю сытуацыі на Усходзе бальшавіцкая дыплёматыя рашыла перамяніць тактыку на Захадзе. Што непашанцавала ім у Азіі, тое яны думаюць дасягнуць у Эўропе. Шляхам лёяльнага супрацоўніцтва з Эўропаю бальшавікі думаюць пранікнуць і ўзарваць яе знутры.

Выпрацаваўшы гэтакі плян, далейшы шлях быў ясны. Пад націскам Нямеччыны і іншых чыньнікаў Швэйцарыя згадзілася нарэшце задаволіць вымаганьні бальшавікоў, перапрасіла іх за забойства Вароўскага на яе тэрыторыі і забавязалася заплаціць сваякам забітага. Гэтым самым канфлікт мог лічыцца зьліквідованным. Гэта чырвонае яечка было паднесяна Эўропе 14 красавіка на Вялікдзень. Гэта зьявілася такой самай неспадзянкаю, як Рапальскі трактат, падпісаны на першы дзень Вялікадня ў 1922 г. у часе гэнуэзскай канфэрэнцыі. Вынікі гэтага акту для Эўропы будуць гэтакія ж самыя.

Як толькі быў зьліквідаваны канфлікт з Швэйцарыяй, бальшавікі адразу згадзіліся на ўдзел у міжнароднай эканамічнай канфэрэнцыі ў Жнэве, якая адчыняецца 4 траўня. Ня трэба шмат тлумачыць таго, на які шкадлівы шлях уступае Эўропа, раскрываючы дзьверы для такіх афэрыстаў, якіх са згоды прадстаўнікоў сусьветных вялікіх дзяржаваў толькі што выкінулі з Пэкіну, нарушыўшы ў адносінах іх нават права экстэррыторыяльнасьці, якою карыстаюцца дыплёматычныя прадстаўнікі ў ўсіх дзяржавах і якія яны самі нарушылі, зрабіўшы з пасольства арсэнал аружжа і прытон усякіх брадзягаў і палітычных праступнікоў. І дзе-ж тут лёгіка? Там у Кітаі бальшавікоў выгналі кітайцы пры дапамозе і з дазволу Эўрапэйцаў, а тут тыя самыя Эўрапэйцы, іх далікатна запрашаюць на міжнародную канфэрэнцыю. Апрача таго, што Эўропа ня мае ніякай амбіцыі і апусьцілася перад бальшавікамі ніжэй Кітая, яна зусім блізкаўзрочная і згубіла памяць. Ці-ж яна забыла гэнуэзскую канфэрэнцыю, скліканую Л. Джоржам спэцыяльна для таго, каб устанавіць супрацоўніцтва з бальшавікамі і немцамі? А атрымала Рапальскі нямецка-радавы хаўрусны дагавор. Макданальд заключыў з бальшавікамі гандлёвы дагавор, запрасіў іх у Лёндан і ў падзяку Англія атрымала падгатоўлены плян рэвалюцыі ўнутры і тое, што цяпер разьвіваецца ў Азіі. Зусім зразумела, што бальшавікі скіруюць усе свае высілкі да таго, каб шкодзіць Англіі на Эурапэйскім грунце і разьбіць усе яе пляны стварэньня антыбальшавіцкага фронту. Пры дапамозе немцаў і іх прыхільнікаў гэта мэта можа быць дасягнута бальшавікамі з поўным усьпехам. І гэта робіцца як раз у той мамэнт, калі Францыя, ня гледзячы на памысны ход перагавораў [illegible] з комунізмам унутры. Францускі міністар унутраных справаў Сарро прачытаў у Алжыры мову, у якой рашуча выступіў процiў бальшавізма, як найвялікшай сусьветнай заразы. Гэтае выступленьне, аналёгічнае з выступленьнем англійскага міністра фінансаў Чэрчыля ў часе візыта ў Рыме, зрабіла вельмі моцнае ўражаньне на эўрапэйскую апінію. Яшчэ ня дасягнута згода з бальшавікамі, а ўжо ўся Францыя кішыць бальшавіцкімі агэнтамі і шпіёнамі. Адкрываюцца адна за другою шпіёнскія арганізацыі, кіраваныя Масквою, склады аружжа, адбываюцца ўзрывы ваенных фабрыкаў і інш. Словам, Францыя знаходзіцца як на вулкане, які можа ўспыхнуць кожную хвілю. І гэта зусім у парадку рэчаў. Не дарма сам Чычэрын сядзіць на поўдні Францыі і кіруе ўсей гэтай акцыяй.

Цяпер можна зьвярнуць увагу на міжнародную эканамічную канфэрэнцыю, якая распачалася 4 траўня і да ўдзелу ў якой запрашаюцца бальшавікі. Гэта будзе найвялікшая канфэрэнцыя, якія толькі адбываліся на сьвеце пасьля апошняй вайны. У ей прымуць удзел прадстаўнікі 52 дзяржаваў. Дэлегацыя кожнай дзяржавы будзе складацца з 5 сяброў, іх заступнікаў і цэлага шэрагу экспэртаў па розным справам. Агулам зьбярэцца больш 600 асобаў. Праграма і мэта гэтай канфэрэнцыі вельмі вялікія. Галоўным ініцыятарам яе быў францускі міністар Лушэр, знаўца па фінансавым і скарбовым справам і самы багаты прамысловец, які здалеў даказаць Лізе Народаў неабходнасьць гэтакай канфэрэнцыі.

Вайна ўскалыхнула сусьветны гаспадарчы гмах да фундамэнту. Усё золата пераплыло да Амэрыкі. Між эўрапэйскімі дзяржавамі парваліся тыя эканамічныя зьвязкі, якія істнавалі перад вайною. Над усім матэрыком запанаваў эканамічна-фінансавы крызіс, які ў розных краях адчуваецца розна. Началася шалёная барацьба за апанаваньне рынкамі, асабліва пасьля таго, як у выніку вайны і азіяцкіх падзеяў многія заморскія рынкі закрыліся для эурапэйскага экспорту. Больш слабыя ў фінансава-гаспадарчы адносінах дзяржавы пачалі ратавацца ад непасільнай канкурэнцыі за „кітайскімі мурамі" пратэкцыянізма, гэта значыць высокіх пошлін на загранічныя тавары, ці поўнай забаронай загранічнага ўвоза. Але прамысловыя гіганты, як Амэрыка, Англія і Нямеччына, церпячыя ад пратэкцыённай палітыкі слабейшых дзяржаваў, маюць тую перавагу, што ў іх руках знаходзяцца ўсе капіталы, якіх патрабуюць першыя. І ў выніку адны бяз другіх ня могуць абыйсьціся. Першаю спробаю ўплынуць на слабейшыя эканамічна дзяржавы з боку мацнейшых быў міжнародны маніфэст капіталістаў, апублікаваны ў мінуўшым годзе, які ў сутнасьці выражаў жаданьне Амэрыкі, Англіі і Нямеччыны. Малыя дзяржавы, на якіх хацелі распаўсюджыць гэтыя тры магутнасьці сваю фінансава-гаспадарчую гэгэмонію, выступілі з рашучым адпорам. І першая спроба сусьветных банкіраў налажыць сваю руку на слабейшых гэтага сьвета пацярпела няўдачу.

Эканамічная міжнародная канфэрэнцыя мае сваёю мэтаю выясьніць усе прычыны перажываемага сусьветнага эканамічнага крызісу і накрэсьліць шляхі для яго ліквідацыі. На ёй будуць разглядацца наступныя пытаньні: выдача пазык асобным дзяржавам, таможанныя абмежаваньні, скасаваньні розных перашкодаў у таварным міжнародным абмене, пашпарты і візы, абмен сыр'ём, прамысловыя трэсты, эміграцыя, земляробства, насяленьне, сацыяльныя рэформы, час рабочага дня і г. д. Ужо адна вялічыня заданьня гэтай канфэрэнцыі дае мала надзеі на яе памыснасьць. Калі-ж да гэтага далучыць яшчэ ўдзел у ей бальшавікоў, мэтай якіх служыць завастраць эканамічны сусьветны крызіс, каб гэтым лягчэй і хутчэй падрыхтаваць сусьветную сацыяльную рэвалюцыю, дык будзе зусім зразумелай [illegible] гэтай [illegible]

У Польшчы.

КАЛІ МОЖНА УЖЫВАЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ Ў ШКОЛАХ І ПРЫТУЛКАХ. У выданым 28 м. красавіка шостым нумары ўрадовага „Дзеньніка" знаходзіцца цыркуляр, які падае гэткае распараджэньне аб ужываньні недзяржаўных моваў у школах і прытулках (урадовых). Паводле гэтага цыркуляра ў дзяржаўных школах і прытулках, а такжа сама і ў публічных пачатковых школах, у якіх выкладовая мова ня ёсьць дзяржаўная (польская) дапушчаецца яе ўжываць: 1) у напісах і абвешчаньнях, скіраваных да вучняў ці іх бацькоў, якія маюць мейсца ўнутры ці звонку будынку школьнага.

Пры гэтым побач з тэкстам мовы выкладовай або зьверху яе павінен быць тэкст у мове дзяржаўнай. Кнігі і школьныя акты трэба вясьці ў двух мовах.

Калі бацькі або апекуны пажадаюць каб пасьведчаньні былі выдаваны вучням у недзяржаўнай мове, тады тэкст гэтай мовы павінен быць зьмешчаны на правым боку побач з мовай дзяржаўнай. Вучыцялі павінны ў сваім часе паведаміць аб гэтым бацькоў або апекуноў. Калі да дырэкцыі ўваходзіць паданьне ў мове недзяржаўнай, адказ даецца ў той самай мове.

Мову недзяржаўную можна ўжываць на паседжаньнях і канфэрэнцыях школьных і ў той самай мове вясьці пратаколы гэтых паседжаньняў.

Распараджэньне гэтае адносіцца і да тых школаў і прытулкаў дзе ўжываецца мова дзяржаўная і недзяржаўная.

Датычыцца гэта і друку на пячатках. Прыватныя школьныя інстытуцыі маюць права ўжываць сваю мову ўва усіх адносінах з вучнямі, бацькамі або з прыватнымі інстытуцыямі, што згаджаецца з 110 арт. Конституцыі.

АРЫШТЫ КОМУНІСТЫЧНЫХ ДЗЕЯЧОЎ. У Паставах палітычная паліцыя арыштавала 16 асобаў, якіх вінавацяць у прыналежнасьці да К.П.З.Б. У гэтым ліку ведамы інжынер Вэйнэр, які быў павадыром пастаўскіх комуністаў. Агледзіны ў памешканьні Вэйнэра далі ў рэзультаце некалькі скрынак выбуховага матэр'ялу, чатыры комуністычных сьцягі і вялікую колькасьць комуністычнай літэратуры. Паліцыя арыштавала таксама і Тамашэўскага, які распаўсюджываў адозвы зьліквідаванай Грамады.

За граніцай.

ПРАМОВА ФРАНЦУСКАГА МІНІСТРА ЎНУТРАНЫХ СПРАВАЎ САРО. Францускі міністар унутраных справаў Альбэрт Саро на банкеце ў Констанціне (Алжыр) меў прамову, якая зрабіла моцнае ўражаньне на



Расправа з комуністычнымі агітатарамі ў арміі Чанг-Тсо-Ліна.

Расстрэл комуністау.

Тайны ўрадовы трыбунал у Пэкіне па трохдневым разгледжаньню справы прыгаварыў на сьмерць праз расстрэл комуністаў, якіх абвінавацiў у здрадзе.

Па апошнім весткам ужо расстрэлена 20 асобаў, сярод якіх адна кабета.

Савецкія грошы у Кітаі.

Па паперах, якія былі сканфіскаваны ў амбасадзе савецкай у Пэкіне даведываюцца, што Саветы дастаўлялі Фэнг-Ю Хсянгу шмат аружжа, а таксама заплацілі 12 мільёнаў серабром. Пасольства савецкае ў Антоне атрымлівала што месяц 15 тыс. даляраў на прапаганду.

Загуба комуністау.

28 красавіка загублены ў Пэкіне ведамы комуніст Літа-Чао і таксама 17 другіх комуністаў, якія былі затрыманы пры вобысках у савецкім пасольстве ў Пэкіне.

Арышты комуністау у Шанхаю.

З Шанхаю надходзяць весткі, што тутака на днях ваенная ўлада супольна з паліцыяй зрабіўшы вобыск арыштавала на тэрыторыі чужаземнага квартала некалькі ведамых комуністаў і агітатараў. Арыштаваным пагражае сьмярць.

Сякера ужо неппатрэбна



У Амэрыцы сякуць лясы ужо не сякерай, а спэцыяльнай машынай.

слухачоў. У прамове выказаў ён пагляд свой, як прадстаўнік ураду на комунізм і са цыялізм. Комунізм, казаў ён, мог знайсьці добры грунт для сваіх экспэрымэнтаў, толькі ў такім краі, як Расея, дзе далёкая адлегласьць ад культурнага сяродка Эўропы, суровая і хмурая прырода вытварыла настрой пэсымістычны, які з часам лёгка перарадзіўся у матэрыялістычна-комуністычны пагляд.

Комунізм родны брат-тэррорыст сацыялізму. Адзін меціць загубіць грамадзянства ў грамадзянскай вайне —гэта комунізм. Другі хоча грамадзянства зьнішчожыць хітрасьцяй, [illegible]. Комунізм гэта нож, сацыялізм гэта —пятля. Абодва вядуць на [illegible] рожніцы ў іх мэтах німа. Абодва толькі [illegible] француская Рэспублікі. Калі комунізм [illegible] ўляецца ворагам грамадзянства, дык сацыялізм яго пасобнік. Варожая дзейнасьць комунізму [illegible] пад ганаровае слова [illegible] калі сапраўды [illegible] [illegible] Усюды комунізм намерываецца кінуць галавешку, каб зрабіць пажар. Сацыялізм жа яму дамагае. Адна работа абодвых. Німа рожніцы, ці запаліць стог [illegible] запалкай ці галавешкай.

Прамова міністра Саро выклікала бурныя авацыі.

НОВЫ ЛАД ПРАЦЫ Ў ФАШЫСТАУСКАЙ ДЗЯРЖАВЕ. 21 г. красавіка на паседжаньні Вялікай Рады фашыстаў у Рыме пад кіраўніцтвам Муссаліні быў ухвалены статут арганізацыі працы пад назовам „Карты Працы".

Між іншым, у першым параграфе гэтай карты гаворыцца:

Італьянскі народ зьяўляецца адзінкай духовай, палітычнай і гаспадарскай, якая выяўляецца аканчальна ў фашыстаўскай Дзяржаве.

У другім параграфе зазначаецца:

Праца ўва ўсякіх формах: прамысловая, тэхнічная, або ручная зьяўляецца грамадзянкім абавязкам. З гэтага пункту гледжаньня і толькі з гэтага падпадае яна пад апеку Дзяржавы.

Мэты працы—гэта добрае паводжаньне грамадзян і разьвіцьце сілы народнай. Як бачым творчасьць італьянскіх фашыстаў рэгулюе працоўнае жыцьцё і ягоны дабрабыт, тады калі комунізм сее сярод працоўных масаў адны забурэньні і няшчасьці.

ОДЗЫУ САВЕЦКАГА ПАСЛА З КОУНІ. На жаданьне літоўскага прэмьера Вальдэмараса савецкі пасол Александроўскі адзываецца са свайго становішча Саветамі.

СЬМЕРТНЫ ПРЫГАВОР. 28 красавіка палявы суд у Коўні прыгаварыў на сьмерць пасла Паяўіса, паручніка Тарнау, падафіц. Жэмайтіса за зраду і намярэньне зрабіць пераварот.

Засуджаныя зьвярнуліся з просьбай да Прэзыдэнта Рэспублікі аб памілаваньні Прэзыдэнт перамяніў сьмёртны прыгавор ні безтэрміновую турму.

БАРАЦЬБА З САЦЫЯЛІЗМАМ У ЛАТВІІ. У начы на 1 траўня латвійскія нацыяналісты паналеплялі на сьцянох дамоў плакаты з надпісам „Сьцеражыцеся" скіраваныя проці ўраду, які яны востра крытыкуюць. У гэтых плакатах месьціцца цэлы рад пагрозаў для ураду. Між іншым пішыцца там, што калі б урад зрабіў палітычны ўклад з С.С.Р.Р. ваенныя рэзэрвісты, якія належаць да партыі нацыянналістычнай, а таксама [illegible] проці левых.

ПЯКЕЛЬНАЯ МАШЫНА НА САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ПАХОД. Паліцыя рыжская зрабіла вобыскі і арыштаваньні сярод сябраў нацыяналістычнай групы. Аказалася, што крайнія нацыяналісты установілі пад адным дрэвам зоолёгічнага саду пякельную машыну з мэтай зрабіць узрыў у тым часе, калі падойдзе да саду сацыялістычны паход.

Падзеі у Кітаі.

Згода паміж Чанг-Кай-Шэкам, Сун-Шанг-Фангам і Чанг-Тсо-Лінам.

Па весткам францускай прэсы Чанг-Кай-Шэк, Сун-Шанг Фанг і Чанг-Тсо-Лін намерываюцца зрабіць дагавор паміж сабой Есьць надзея, што гэты дагавор зьдзейсьніцца.

У. С. С. Р. Р.

Не ўдаецца.

Паводле справаздачы прапагандавай камісіі Цэнтр. Выканаўчага Каміт. Комуністычнай партыі Беларусі, выпушчаная прапагандная часопісь „Безбожнік" даў результаты с ўсім незначныя ў працягу першай чверці г.г. хоць і пхнулі разношчыкі яе гвалтам у рукі сялянам. У некалькіх местах разношчыкау проста пабілі. Дык вось нарэшце камісія патановіла паменшыць разноску гэтай часопісі.

Падатак з работнікаў на кітайскую агітацыю.

Калі на вечу ленскай фабрыкі „Чырвоны октябрь" была пададзена рэзалюцыя аб дабр вольным аблажэньні работнікаў адна працэнтавым падаткам на карысьць кітайскага Комінтангу, паднялася спрэчка з боку непартыйных працаўнікоў, якія мелі па віду узрастаючую даражыню прадуктаў. Некалькі упёршыхся арыштавалі і пасадзілі ў турму, як сабатажнікаў. Паводле савецкага закону пагражае ім кара ад 3 да 5 гадоў турмы.

Выбары на зьезьдзе саветаў.

На першай сэсіі Ц.И.К. быў выбраны прэзыдыум у ліку 27 сябра, у гэтым ліку 6 прэдседацеляў; Калінін, Пятроўскі Чэрвякоў Муссабскаў, Гэджаеў, Айтакаў. Сэкратаром Ціка выбраны аказаўся Еўнукідзе.

У склад рады камісараў вайшлі: Рыкаў —паведыр, Чічэрын справы загр., Варашылаў—войска і флот, Рудзутак—комунікацыя, Смірноў—почта і тэлегр.ф, Орджонікідзе—кантроль селянска-работнікі, Шмід—праца, Мікоян—гандаль, прамысл, Брюханоў—фінансы, Куйбышаў—паведыр усесоюзнай гаспадарскай рады, Осіньскі—кіраўнік ураду статыстычнага.

Ня плюй да студні..



Бальшавік: Маш табе стрэльбу, цяпер бій англійца.

Кітаец: Добра, братка, але спрабую яе на табе. „Mucha"

П. Раманаў.

Трудная справа.

(З расейскага).

Гэтае апаведаньне, друкованае ў Маскоўскім „Зборніку" літэратурных твораў за 1925 г. лепей усяго характэрызуе як „надзелялася" зямля сялянам. (Рэд.).

На чарзе была зусім новая справа: падзел абшарніцкае зямлі. Зборка адбывалася каля гэрбацярні на траве.

Старшыня выняў з бочняй кішані фрэнча гадзіньнік і паглядзіўшы на яго сказаў:

— Адчыняю сход. Тав рышы, зямлю дзяліць будзем шчэ ня сяньня, як-бы вы жадалі, а заўтра. А сяньня пагутарым аба ўсім.

Усе гутаркі заціхлі. Ніхто нічога не адказаў.

— Каб гутаркі пасьля ня было—сказаў Тодар.

— Дзяліць будзем не на ўласнасьць, а на часовае карыстаньне, сказаў старшыня.

— Каб на тэрмін толькі—нерашуча паясьніў Тодар, як бы саўсім ня пэўны свайго паясьненьня.

Ня гледзячы на паясьненьне Тодара—ўсе загудзелі.

— Гэта, значыцца—ваявалі, ваявалі, і ізноў наконт зямлі ўпёрліся?..

— Абуць нас хочуць...

— Раней, хоць якая там ні была, а была ўласнасьць, сказаў Янка Нікіціч—а цяпер ака хочуць ужо і да яе дабрацца..

— Але, справа гэта ня надта каб... сказаў Тодар і адыйшоўшы ад ганку гэрбацярні—плюнуў.

— Але-ж: выходзіць так: працуем, гаруем, а яна ўсё ж т'кі не твая...

Старшыня стаяў моўчкі на ганку і слухаў паглядваючы то ў адзін, то ў другі бок, у залежнасьці ад таго, дзе больш крычэлі.

— Цяперака я гаварыць пачынаю! Слухаць? крыкнуў ён.

Усе замоўклі.

— Гаманіце, а чаго і самі ня ведаеце. Гэта робіцца дзеля таго, каб кулакі не маглі скупляць зямлю ад бяднейшых. Бедны можа аслабець, кулак купіць у яго зямлю, вось ён ізноў голы як сакол. А калі ўласнасьці ня будзе, дык ніхто бядняка ня зможа давясьці да торбы.

— Ен бы рады быў скупіць, абадраць беднага чалавека,—сказаў Тодар ізноў падыходзячы да ганку,—але нельга, бо закон бароне...

У ён ўгледзіўся на старшыню, шукаючы сьцьверджаньня сваіх слоў.

— Гэта правідлова! сказалі нерашучатыя, што стаялі на перадзі.

— Што-ж тады, так вiдаць і патрэба—адгукнуліся ззаду.

— Вось, скажам, у мяне зямля пачала кепска радзіць—сьціха казаў Тодару Панас—калі на ўласнасьць, дык я гэтак і сядзі, значыцца на ёй пакуль ня здохнеш, а як на часовае ўладаньне—дык пры другім перадзелі я ізноў сьвежанькай атрымаю.

Усе сьціхнуўшы слухалі, што кажа Панас.

— Або, скажам, у мяне на другі год размые равы, ці бугры выскакнуць—сказаў Сапрон—тады гэтую бяры сабе, а мне падай добрую.

— Правідлова! сказалі ўсе.

— Значыцца сход аканчальна рашыў на часовае карыстаньне? спытаўся старшыня.

— Чакай! чакай! Дазволь скумекаць! пасьпешна крыкнуў нехта - а то і не сьцяміш адразу...

Усе замоўклі і пачалі пераглядацца.

— Бач, не пападзі.. не вядома хто сказаў ззаду.

— Нязгодны!... пасьпешна крыкнулі амаль усе, у адзін голас.

— Пэўне-ж: прымем на сваю шыю, а потым расплутывайся, сказаў Тодар.

— Я сваю буду ўгнаіваць, хадзіць за ёю, а які небудзь гультай, і аднаго возу на сваю ня вывезе і яму праз нейкі год адыйдзе мая ўгноеная, а я—атрымлівай благую, посную, сказаў Янка Нікіціч.

— К чорту! не жадаем! закрычэлі ўжо ўсі. На ўласнасьць давай.

Старшыня стаяў на ганку, не казаў ні слова і спакойна глядзеў на мужыкоў, якія прад самым яго носам размахвалі рукамі і крычалі, што іх не падкуеш, бо головы іх шчэ, хваліць Бога, здаровыя і працуюць.

— Вашая воля, бярыце на ўласнасьць,—сказаў ён,—толькі вы тутка мусіць спудлуеце.

— А што? трывожна спытаўся голас з натоўпу.

— А то, што калі атрымаеце на ўласнасьць, дык колькі каму прыдзецца, столькі і застанецца назаўсёды.

А калі на часовае карыстаньне, дык можаш атрымаць па меры патрэбы: скажам радзіўся ў цябе сын—атрымлівай лішнюю гоню на яго. Або хто выпісаўся з абчаства—ізноў ідзе дзялёж на роўну.

Усе маўчалі.

— Калі прыбаўляецца, дык што-ж, трэ падумаць..

— Ці мала хто захоча выехаць, не захоча ў вёсцы жыць, сказаў Тодар,—вось яго зямлю і давай.

— Правідлова! тутка і думаць няма чаго! закрычэлі ззаду.

— Значыцца: пастаноўлена?

Ужо-ужо ўсе гатовы былі згодзіцца, ды нехта ззаду сказаў:

— Гэта выходзіць: нейкі чорт сплодзіць цэлую кучу бахуроў, а ў мяне для яго адымаюць зямлю?.. Здорава!

— Яны будуць бахуроў пладзіць, а ім зямлю прыпісаць? Такжа здорава!

Падыйшлі яшчэ некалькі спазьніўшых гаспадароў. Гэта ўсё былі маладыя салдаты, якія вярнуліся з фронту, або работнікі з фабрык Яны ўзайшлі на ганак, селі побач старшыні і круцячы папіроскі пaглядалі на натоўп

Потым адзін з іх у расшпіленай шынэлі ўстаў і сказаў:

— Прашу слова.

— Гэткім вось чынам вы будзеце гама-

ФІНАНСЫ і ГАСПАДАРКА.

Коопэрацыя у украінцаў.

Цяпер ня трэба ўжо тлумачыць, якое вялізарнае значэньне мае коопэрацыя ў жыцьці як работнікаў, гэтак сама і сялян. Апрача таго, што дзякуючы коопэратыўнай арганізацыі эканамічнага жыцьця опажывец безпасрэдна зьвязваецца з вытворцам і гэтым самым збаўляецца ад цэлай арміі пасрэднікаў-гандляроў, якія ня толькі кормяцца ад гэтага, але складаюць вялізарныя капіталы за рахунак спажыўцаў, коопэрацыя мае яшчэ вельмі вялікае значэньне як школа арганізацыйна-грамадзкай працы. Дзеля гэтага коопэрацыйны рух, пачаўшыся ў мінуўшым сталецьці ў Англіі сярод работнікаў, хутка ахапіў увесь сьвет, прыцягнуўшы да коопэратыўнай працы работнікаў, сялян і працоўную інтэлігэнцыю. І чым вышэй стаіць культура данай нацыі, тым шырпш коопэратыўны рух. Гэткім чынам па стопні коопэратыўнага руху можна судзіць аб вышыне культурна-палітычнага ураўня данай нацыі. У гэтых адносінах могуць служыць для нас прыкладам нашы браты ўкраінцы, якія з цэлым запалам аддаліся коопэрацыйнай працы.

Коопэрацыя ў Усходняй Галіцыі стаяла на даволі высокім ураўні яшчэ перад вайною. Вайна часова затрымала гэты рух, але з 1920 г. ён ізноў аджыў і шпарка пачаў разьвівацца па ўсей тэрыторыі Усходняй Галіцыі і Валыні. Рэвізыйны саюз украінскіх коопэратываў у Львове нядаўна выдрукаваў і выпусьціў у сьвет справаздачу сваей працы, за 1925 г., якая яскрава ілюструе ўвесь аб'ем гэтай культурна-арганізацыйнай працы. Гэта першая пасьля вайны і спыненьня спадка польскай валюты спроба залажыць моцны фундамэнт пад гмах супольнай эканамічнай арганізацыі народу. У прадмове да гэтай капітальнай працы гаворыцца, што „пяць першых гадоў працы на пасьля ваенным пагарэлішчы матэрыяльных і маральных вартасьцяў даволі кароткі, каб можна было правясьці поўны ўсебаковы і дасканалы коопэратызм, якога вымагае нашае народнае гаспадарства. Пяць першых гадоў працы — гэта першы этап на шляху да падгатоўкі шырока прадуманай коопэрацыі дробных гаспадарскіх сіл нашага народу. У першую чаргу была зьвернута найбольшая ўвага на развіцьцё коопэратыцыі сялянства, як найболей вялікай, найбольш вызысківанай вартасьці нашага народу, з якой народ вырастае, маладзее і сілаю якой крапчэе. Але не была занедбана праца над арганізацыяй іншых вартасьцяў пад лёзунгам коопэрацыі.

У пачатку на чале усяго коопэратыўнага руху стаяў „Камітэт Арганіз. Коопэратываў" (К.А.К.), у склад якога ўваходзілі прадстаўнікі Рады Рэвізыйнага Саюзу Украінскіх коопэратываў" Таварыства „Прасьвета", гаспадарчага Т-ва „Сялянскі Гаспадар", Краёвага Крэдытнага Саюзу (цяпер „Цэнтра-Банку"), „Народнага Гандлю" (цяпер краёвага спажывецкага саюзу), краёвага саюзу гаспадарчых таварыстваў („Цэнтральсаюз") „Маслассаюза" і „Краёвага саюзу для збыта жывёлы".

Праца Краёвага К. А. К. ішла ў кірунку адбудовы зруйнованых вайною коопэратываў, рэарганізацыі краёвых гаспадарчых цэнтраляў і арганізацый новых, прытарнаваных да вымаганьняў, часу аднатыпавых земляробных і г. д. Усе коопэратыўныя інстытуцыі згодна з праграмаю краёвага К. А. К. павінны пашырыць сваю акцыю і на культурна-асьветную галіну.

Пад кіраўніцтвам Краёвага К. А. К. пачалі працу павятовыя К. А. К. Хутка край пакрыўся сеткаю коопэратываў. Р.С.У.К., як ідэйная цэнтраля ўкраінскага коопэратыўнага руху, узяў на сябе ў 1922 г. функцыі краёвага К. А. К. З гэтага часу Рада Р. С У. К. зьяўляецца найвышэйшым кіруючым органам украінскага коопэратыўнага руху на заходніх землях. Для лепшага і больш спраўнага кантролю над усімі коопэратывамі ўвесь абшар разьдзеляны на 7 коопэратыўных раёнаў. Затым Рада Р. С У. К. вайшла ў склад міжнароднага коопэратыўнага Союзу ў Лёндане і ўстанавіла кантакт з украінскімі коопэратыўнымі інстытуцыямі за граніцаю Мае сваю бібліотэку для патрэб коопэратыўных служачых, у якой ў 1925 г. лічылася 1184 кніжкі. Апрача таго выпісывае газэты і журналы коопэратыўнага зьместу на рожных мовах і выпускае свой тыднёвік, насьвячоны выключна коопэратыўным справам Украіны і іншых народаў. Балянс Р.С.У.К. за 1925 г. дасягнуў 401, 419 зл.

Р.С.У.К. лічыў к 31 сьнежня 1925 г. 1029 коопэратываў, як сваіх сяброў, якія складаліся ў наступнай чарзе: а) цэнтрасаюз, коопэратыва III ступені. б) 5 краёвых цэнтраляў, якія зьяўляюцца коопэратывамі II ступені (Народны Гандаль, Маслассаюз, Краевы саюз для гадоўлі і збыта жывёлы, цэнтрабанк). в) 26 чыстых коопэратываў II ступені раённага характару, як павятовых цэнтраляў. г) 997 коопэратываў I ступені, абавязкам якіх было навязаць безпасрэдні кантакт з фізычнымі сябрамі як спажыўцамі гэтак сама і вытворцамі.

Паводле свайго тыпу коопэратывы ў у 1925 г. складаліся: а) 860 коопэратываў, якія галоўным чынам абслугуюць сялян. б) 113 крэдытных коопэратываў, у тым ліку і цэнтрабанк. в) 27 гарадзкіх спажывецкіх кооп., у тым ліку і Народны Гандаль г) 29 гандлёва-заработных (выдавецкіх, папярова-галантарэйных і інш.). Разам 1029.

Усе гэтыя коопэратывы мелі у канцы 1925 г. 150, 949 сяброў. Паводле ўрадовай статыстыкі ад 30.IX 1921 г. у трох украінскіх ваяводзтвах (львоўскае, станіславаўскае і тарнопальскае) было 2,721,242 украінскіх жыхара, што складае каля, 514, 257 украінскіх гаспадарак, сярод якіх 100, 446 згуртавалася у Р. С. У. К., радстаўляючы інтарэсы пол мільёна насяленьня.

Сацыяльны склад сяброў 912 коопэратываў (808 салянскіх, 26 гарадзкіх, 57 крэдытных і 12 іншых) наступны: 134,183 (ці 88,89 проц) сяляне, 2,443 (1,62 проц) рамесьнікі, 2,013 (1,33 проц.) работнікі, 8,551 (5,51 проц.) інтэлігэнцыя і 959 (2,62 проц.) іншыя сацыяльныя слаі.

Агульны балянс к 31. XII 1925 г. быў гэтакі: актыў: гатоўка—397,818, тавары—1,917,161 зл., прадукты—37,095 зл., грашовыя пазыкі—157,453 зл., вэксельныя пазыкі—1,391,683 зл., цэнныя паперы—50,689, таваровыя даўжнікі—402,660, уклады—411,187, нарухомасьці—2,414,290 зл., рухомасьці—478,780 зл., іншыя—298,309 і страты—79,041 зл. Разам 8,220,672 зл.

Пасыў. Запасны фонд—1,112,774 зл., уклады — 992,009, уклады для абароту—2,721,451 зл., крэдыты—651,659, таварныя даўгі—1,835,841, іншыя—952,655 і прыбыль—454,253 зл. Разам—8,220,672 зл.

Да супрацоўніцтва ў коопэрацыі прыцягнуты ўсе нацыянальныя культурная інтэлігэнтныя сілы, як настаўнікі, інжэнэры, аграномы, тэхнікі, урадоўцы самаўрадаў і г. д. 150,000 сяброў коопэратываў—гэта цэлая нацыянальная ўкраінская армія, падпарадкаваная аднаму цэнтральнаму ўраду, якая, свядомая эканамічна, моцна стаіць на варце нацыянальных інтарэсаў свайго народу. З гэтакім народам будуць лічыцца як яго прыяцелі, гэтак сама і ворагі. На жаль, беларусы ня маюць гэтакай моцнай зусім легальнай коопэратыўный арганізацыі

S.

Біржа.

Даляры	8, 94—8, 90 зл.
Залаты рубель	4, 63 зл.
Сярэбраны рубель	2, 76 зл.
Чырвонец	33, 75 зл.

Збожжа

(Варшава)

Жыта (100 кілагр.-6 пудоў)	48—48, 50 зл
Пшаніца „ „	— 58 зл.
Ячмень брав	39 — 41 зл.
Ячмень крупяны	— 36 зл.
Авёс „ „	— 39 50 зл.

(Віленшчына)

Жыта (100 кілагр.)	— 42, — 43, — зл.
Пшаніца „ „	— 50 — 55, — зл.
Ячмень браваровы	39 — 43 — зл.
Ячмень крупяны	36 — 41 — зл.
Авёс „ „	37 — 42,— зл.

Аутамабілі у Амэрыцы.



Станцыя самаходаў у Бастоне (Амэрыка) раніцой.

Жыцьце провінцыі.

„Мы, Сельсаюзнікі нясём сваю бандыцкую культуру на родную вёску...".

(Слонімшчына).

Каля 15 красавіка г. г. на палях вёскі Селявічы інструктарам „рольным" быў пасеяны штучны навоз на палетках Цьвікевіча пры дарозі. Пасьля былі пастаўлены для арыентацыі спэцыяльныя таблiцы з надпісамі гдзе колькі якога навозу пасеялі. — Трэба адзначыць, што проба са штучнымі навозамі праводзіцца ў нашай гміне першы раз. Усе цікавяцца, што з гэтага будзе ў канцы. Ініцыятарам гэтай пробы ёсьць „Koło Rolnicze" ў Селявічах, на чале якога стаяць ўсімі паважаныя грамадзяне.—Трэба дадаць і тое, што ў ліку сяброў стаіць інтэлігэнцыя вясковая зложаная з палякоў і беларусаў, якія згодна і супольна працуюць разам над разьвіцьцём сваіх гаспадарак.

Пасьля першага пасеву, праз некалькі дзён меў быць дадаткова на спэцыяльных мейсцах пасеяны навоз „азотняк". У тым часе б. грамадаўцы, а цяпер „гарачыя" сельсаюзьнікі з в. Юхнавічы, прыйшлі ноччу і забралі ўсе таблiцы з поля, а пасьля стапталі нават зямлю, гдзе быў пасеяны навоз! Проста ня верыцца, што гэта маглі зрабіць людзі... аднакаж ёсьць цьвёрды факт, што гэта выключна зрабілі Белькевічы, Каленевічы і іхнія блізкія прыяцелі з в. Юхневічы, раней шчырыя грамадаўцы, а цяпер, дзеля выкарыстаньня легальнай партыі Ярэміча для падпольнай „працы" ў комуністычным напрамку—прыяцелі і „сымпатыкі" Сельсаюза...

Гэтыя культур—бандыты проста кажуць паміж сваімі хлопцамі, што не зрабілі-б гэтага, калі-б навоз быў пасеяны прадстаўнікамі гуртка Б.І. Гаспад. і Культуры (якой?)

Адзначаем тутака—што нігдзе ў нашай гміне ніколі не было, німа і ня будзе гэткіх гурткоў — бо людзі нашы ня вераць Ярэмічам і Більдзюкевічам хаця дарма шлюць сваю „Ніву" нам.

Ось, браткі, якіх сымпатыкаў і працаўнікоў мае ў сваіх шарэнгах Сельсаюз.

Няхай чэсныя грамадзяне ўсіх куткоў асудзяць гэтых рэйкманска-дзікі [illegible]

Малачка.

„Дзікары".

(Слонімшчына).

Восеньню прошлага году малыя дзеткі пад кіраўніцтвам сваіх вучыцялёў пасадзілі блізка 500 штук рожных дрэвак каля дарогі вёсак Мількановічы і Салёнікі, Чамерскае гм.

Надта не падабалася гэта праваднікам здохлай памяці „Грамады" і праз адну ноч вырвалі амаль не 400 штук маладых дрэваў раскідаючы пасьля па балоце, гдзе трудна ступіць нагою... Малыя дзеткі, бачучы сваю працу зьнішчанай, плакалі...

Ганьба вам, Балі, Татарыны і іншая пошкудзь комуністычнага напрамку, за вашыя паступкі—дзіка-бандыцкія, і за гэтый яд, які па сабраньнях пускалі ў душу Белар. народу!

Адміністрацыйным парадкам Слонімскі староста аштрафаваў вёскі Мільканавічы і Салёнікі разам на 2,000 злот. за гэта варварства.

Юрка.

АБВЕ[illegible]А.

Т-ва „Беларуская Хатка ў Вільні,

На 15 траўня г. г. вызначаецца гадавы агульны сход сяброў „Беларускай Хаткі" ў памешканьні: Завальная вуліца д. № 6 [на гадзіну 6 вечара.

Парадак дня

1. Справаздача Ураду.
2. Перавыбары Ураду.
3. Бягучыя справы.

Урад Таварыства.

ніць да самай начы, а толку ў рас роўна ніякага ня будзе, сказаў ён. І ўсе будзеце хадзіць жабракамі. А хочаце ці не жыць па-чалавечаму?

— Чаму-ж не?...

— Ну, дык вось. Тады трэ ўсім ня толькі зямлю, а ўсе разам рабіць. А то ў аднога скажам—ёсьць малатарня: вось ён сабе малоціць, а іншыя—аблізывайся. У другога зямля ёсьць, а каня няма.

А зрабіць усё супольнае: зямлю, скаціну, інвэнтар,—дык у кожнага ўсё будзе. Добра я кажу, таварышы, ці не?

— Правідлова,—нерашуча адгукнуліся ўсе.

— А то іншаму патрэбна што—пойдзе прасіць у суседа, а дадуць табе ці не—гэта шчэ няма ведама.

— Нізашто ніхто ня дасьць! дружна ў адзін голас сказалі ўсе.

— Вось разумны чалавек прыйшоў, адразу ўсё стала на сваё мейсца...

А тады ўсё абладзім у найлепшым відзе: зямля супольная, значыцца і насеньне супольнае. Ссыпім ўсё ў адзін сьвіран дый годзе!

— Па патрэбе і карыстацца...

— Гэта я значыцца буду карак ламаць, а Захар Аляксееў, што вось увесь час сядзіць сабе на завалінцы—будзе карыстацца?—сказаў ізноў Янка Нікіціч.

Захар Аляксееў, дагэтуль сідзеўшы на бэльцы з апушчанай галавой, па свайму звычаю трымаючы бараду ў далонях, падняў голаў, паглядзіў на Янку і ізноў апусьціў голаў.

— А вось я зараз спытаюся, сказаў прамоўца—таварышы, ён бяднейшы?

— Бяднейшы,—сказалі ўсе.

— А што, павінны мы ці не памагаць тым, хто больш слабыя?—спытаўся гулкім голасам прамоўца сярод агульнай цішыні.

— Ці-ж мы зьвяры нейкія ці што? адгукнуліся ўсе.

— Значыцца пытаньне адпадае. Далей трэ будуць складніцы для ўсяго скажам на малако. Пабудуем агульную лядоўню і паставім яе сярод вёскі, каб нікаму ня было-б крыўдна.

— Каля царквы—сказаў Тодар,--гэта добра.

— Зажадаў хлібнуць малачка—лётай з Богам з Іванаўскай слабады сказаў Сымон Папіў—гэткім жа манерам узад. Разоў тры зьлётаеш—лепей спаць будзеш...

Усе агледзіліся на яго і сумна маўчалі. Ніхто нат не ўсьміхнуўся на жарт.

— Ну, браткі, прост мазгі пераварачваюцца, сказаў нехта.

— Але! добрую ім работу задаюць!

Устаў старшыня і пастукаўшы па сталу алаўком сказаў:

—Вунь у гарадах, на фабрыках цяперака ўсе разам будуць абедаць, па званку; нікаму асобна і варыць ня трэба. Мы также можам гэтак зробіць. То ў вас дзьве сотні гаспадыняў абеды варацъ, а трэ будзе самае большае дзесяць Іншыя—на што другое, што патрэбна, рабі сабе. Правідлова?

— Правідлова, нехаця сказаў нехта і дабавіў: Гэты чорт як падчэпіць, дык і павязе, каб ён прапаў!...

— Набраліся там...

— Што-ж гэта мы сабакі вучоныя ці што? па званку будзем бегаць?

— У цябе мо' брух баліць, а ў гэты час: бах-бах у звон гэты самы б'юць Знацца хапайся дый ляці на зламаньне карку? сказаў яшчэ адзін голас.

— А мо, скажам—да кумы зайшоў, а тут ізноў гой звон; знацца кідай ўсё дый ляці?

— Не жадаем! Адкатывайся! закрычэлі ўсе і загаманілі пераплутаўшыся паміж сябе. А Мікола—шавец ускочыў на бэльку і пачаў гаварыць проці.

Тыя, што сядзелі на ганку пачалі нешта гаварыць старшыні, але ён, не слухаючы стаяў і глядзеў на мужыкоў. Потым зыйшоў з ганку і моўчкі стаў на дубовы абрубак. Мужыкі, якія ўжо пачалі зьбірацца каля Міколкі, каторы гаварыў проці старшыні.

— Які чорт, чаго стаіць? — спытаўся нехта

— Відаць, казаць нешта хоча.

— Дык чаму-ж маўчыць?

— Чорт яго ведае што, стаў вось стаўбом нейкім і маўчыць—казалі ў натаўпе.

Аднак тыя, што гэтак казалі — працісківаліся праз натаўп, памалу падыходзілі да старшыні і станавіліся вокал яго. І чым ён даўжэй маўчаў, тым менш станавіўся круг слухачоў каля Мікалая.

Нарэшце нехта крыкнуў Мікалаю:

— Годзе табе брахаць! Завёў млын свой а як жа!

Ня бачыш, што чалавек казаць хоча?

І, калі Мікалай застаўся адзін на бэльцы, старшыня падняў уверх руку з алавікам і сказаў:

— Нагаманіліся?

— Нагаманіліся... прабурчэў нездаволенна нехта.

— Ну, дык і добра. А цяперака дзела рабіць трэба. А то вас ня спыні, да заўтрашняга дню гаманіць усё будзеце.

— Правідлова! дружна адгукнуліся ўсе.

— Ад агульнага ўладаньня маемасьцяй — звальняецеся,—сказаў старшыня. Ніхто вам ня мае права наказываць. Вашая воля ўва ўсім...

— Ага, спусьціў...

— Вось гэта маладзец! сказаў нехта.

— А зямля застаецца на часовае карыстаньне, казаў далей старшыня, ня гледзячы ў бок гукаўшых,—і ў гэтым вам ніхто забараняць нічым ня можа.

— Чакай! чакай! Мы-ж і не зьбіраліся...

Мала што не зьбіраліся. Покуль вы будзеце зьбірацца, дык палова з голаду падохне ..

— Правільна! ізноў дружна адгукнуліся ўсе.

— Значыцца прынята! сказаў старшыня.

Злавіліся! зціха сказаў нехта ззаду.

Мужыкі ўжо былі ўскалыхнуліся, ды старшыня зыйшоў з абрубка і ўсходзіў на ганак...

Пераклаў Б. Д.

Арганізацыя гуртка „Прасьветы“

(в. Гецгалы, Лідзкага пав.)

У в. Гецгалах Беліцкай воласьці Лідзкага павету арганізаваўся гурток Беларускага Таварыства „Прасьвета“, пры якім у хуткім часе адчыніцца бібліятэка, а таксама арганізуецца аматарскі гурток, які будзе ладзіць спэктаклі. Мэтай гуртка зьяўляецца толькі культурна-прасьветная праца сярод тутэйшага сялянства. Ніякай палітыкай займацца ён ня будзе.

Аднак ня гледзячы на тое, што „Прасьвета“ перасьледуе выключна мэты культурна-прасьветныя, некаторыя цёмныя асобы, вастрожнікі — якія ўжо адбылі сваю кару, перашкаджалі арганізацыі гэтай культурнай пляцоўкі. Але відаць гэтым рэвалюцыянэрам не патрэбна прасьвета... Аднак ня гледзючы на іх пагрозы і перашкоды гурток арганізаваўся і будзе вясьці карысную працу на карысьць свайго народу. Наагул „Прасьвета“ цяпер ідзе ў гару і па ўсім нашым Навагрудзкім ваяводзтве раскінуліся яе гурткі.

Грамадзяне, маладыя хлапцы і дзеўчаты! арганізуйце ўсюды гурткі „Прасьветы“ ў сваіх вёсках, або ўваходзьце да гурткоў, дзе яны ўжо ёсьць. Праз культурную працу да дабрабыту!

Трагэдыя сям'і.

21 красавіка у вёсцы Савічы Дзятлаўскае воласьці Навагрудзкага павету застрэліўся быўшы старшыня гуртка Назалежнай Партыі Хлопскай гэтай вёскі Янка Пранюк. Прычына гэтакая: маці Пранюка была вельмі незадаволена, што ён зьяўляецца сябрам Н.П.Х. і нават пракляла яго і сама пайшла на 12 Эвангельяў у царкву. Вярнуўшыся да дому яна даведалася, што сын яе застрэліўся. Знайшла яго ў суседзяў у лужы крыві.

Няхай гэтая трагэдыя паслужыць перасьцярогай для іншых маладых гарачых галоў, якіх рожныя Грамады і Н.П.Х. уцягнулі да сваей агіднай працы і якія з роспачы хапаюцца за рэвальверы.

Сарока.

Грамадаўскі чад.

(в. Райкі Скідэльскае гм.)

У паветры павеяла цяплом. Як пчолы заварушыліся сяляне гатовячыся да палявое працы. Ад рана да вечара раздаецца вясёлы гоман сялян, за тое ўвечары ў вёсцы пануе заціша, змучаныя сяляне сьпяць салодкім сном, каб заўтра ледзь сьвет на нова прыступіць да працы. І толькі сярод цішыны раздаюцца [illegible] п'яныя галасы [illegible]эта вядомыя „таварышчы“ навадзіўшыя страх на ўсю вёску за часоў, ліхой памяці Грамады: Васіль Салей і яго супольнік Мікола Сіткевіч з якім разам „дзяжурылі“ ў Гарадзенскім вастрозе, а таксама Юрка Лабань, брат яго, Міхно і другія пяюць „інтэрнацыянал“ і іншыя рэвалюцыйныя сьпевы, якія рэхам адбіваются ўва ўсей вёсцы, наводзячы прыкрае ўражаньне на сялян. Памянёныя „таварышы“ не гледзячы на поўную ліквідацыю „Ком-Громады“ яшчэ і цяпер робяць сходы, ведама ж пры гарэлцы і вераць, што 1 мая пачнецца паўстаньне, пераконываючы ў гэтым некатарых сялян. Дзеля гэтага Салей супольна з Сіткевічам, які перайшоў да яго на супольнае жыцьцё з в. Мастаўляны Скідэльскае гм. прадавалі што толькі мелі на гарэлку, адным словам прапілі ўсё тое, што атрымалі ад Грамады. А таксам і ўсё тое, што ўкралі як н. п. плугі, вазы, хамуты і т. д, а калі гэтага не хапіла, дык Салей прадаў апошняга коніка—кажучы ўсёроўна будзе рэвалюцыя, дык нашто-ж ён—гэты конь мне я тады ў буржуяў забяру сабе найлепшыя коні“. За грошы атрыманыя за каня, накупілі гарэлкі, каўбасаў і цяперь п'юць сьпеваючы „інтэрнацыянал“ і чакаюць рэвалюцыі.

Сяляне з пагардай глядзяць на гэтых дармаедаў. Цікава тут тое,—што гэта было-б і на каго спадзеваліся сяляне, каб усе так рабілі, як памямёныя асобы ў каго'ж тады кралі б? Дармаеды!.

Чудзіла.

Тутэйшая хроніка.

Беларуская мова ўв дзіцца ў духоўнай сэмінарыі. Міністэрства Рэлігійных Веравызнаньняў і Публічнае Асьветы пазволіла праваслаўнай духоўнай сэмінарыі на выкладаньна беларускай мовы, на якую прызначаецца 16 годзін у тыдзень.

Арыштаваньне савецкага шпіёна ў Вільні. У сувязі з падгатаўленьнем да комуністычных выступленьняў к 1 траўня палітычная паліцыя арышт вала ў Вільні паважнага савецкага шпіёна, прозьвішча якога пакуль што не выяўляецца. Ведама толькі, што ён сын аднаго з віленскіх урадоўцаў і быўшы вучань 6 клясы аднэй з гімназіяў Раней ён скончыў у Расеі военна-палітычную школу ў Ташкенце а затым быў на службе ў мінскім аддзеле Г.П.У. Вярнуўшыся ў Вільню ён заняў пасаду ўрадоўца ў аднэй з вайсковых інстытуцыяў, якая мела шмат военных тайнаў. Будучы арыштаваным ён прызнаўся што быў пасланы савецкім урадам у Польшчу з мэтай вясьці шпіёнскую работу. Паддзержываў яго і кантраляваў савецкі пасол у Варшаве.

Роспуск мястовай Рады ў Вільні. Міністар унутранных справаў гэн. Складкоўскі, па прапазыцы Ваяводы Рачкевіча, 28 мінулага красавіна распусьціў Мястовую Раду ў Вільні.

Новыя выбары ў Раду павінны быць зроблены ў працягу 3 тыдняў ад дня роспуску.

Вучням ня можна насіць палак. Бяручы пад увагу, што вучні сярэдніх школаў часта ходзяць па вуліцах з ляскамі Віленскі Куратарыум забараніў вучням хадзіць з палкамі па вуліцах.

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Пане Рэдактар!

Ветліва прашу зьмясьціць некалькі гэтых словаў.

З прычыны таго, што Сялянскі Саюз кіраваны паслямі Ярэмічам і Рагуляй у апошнім часе пнецца насьледаваць так праграму, як і тактыку Грамады якая прынясла столькі шкоды і няшчасьцяў Беларускаму Народу, я ніжэй падпісаны ня хочучы мець нічога супольнага з напрамкам палітычным, які свае сілы намерываецца будаваць на нянавісьці і барацьбе клясовай — гэтым пасьведчаю аб сваім выступленьні з Сялянскага Саюзу.

Люцыян Міцька.

былы рэдактар „Сялянскай Нівы“

Слонімская хроніка.

10.IV.27. ў Міжэвічах, была зарганізавана каса „Społdzielcza“, якая для жыхароў тае-ж гміны будзе мець вялікая значэньне.

Апрача Міжэвіцкай і Чамерскай гмінаў усе гміны дасталі грошы як пазычку сеўную. Цікава ведаць, чаму гэтыя дзьве гміны так нешчасьлівы і дагэтуль грашаў не дасталі.

Ад 1.IX.27 г. ў фольв. Езёрніца мае быць адчынена сельска-гаспадарчая школа для дзяўчат.

22.IV.27, а 12 гадзіне ўначы паліцыя схапіла комуністычнага „тэхніка“ ў в. Касьцяні, нейкага жыдка. Знайдзена пры ім шмат кампрамітуючых дакумэнтаў. Пасьля гэтага зараз-жа быў арыштаваны ведамы комуніст, б. сябра-гуртка ў Кацянях, Чамерскай гм. да якога ішоў тэхн к-жыдок“.

„Вялікі палітык“ аканчальна скампрамітаваўся тутака. Сялянства нашых вёсак рагоча са сьмеху! Чаму? Які „пан“ (Ярэміч) такі-крам (карэспандэнт Квас) так кажуць нашыя селяне, якім дарма „Партыя Самахвалаў“ з пад знаку Ярэм-еі Со высылае сваю „Селян. Ніву“ (жыхары вельмі ахвотна біруць „Сел. Ніву“ на цыгаркі - прысылайте больш.).

Апошнім часам „Сел. Ніва“ атрымала надта цэнны падарак: карэспандэнта Кваса (псэўдонім),—ведамага кандыдата на канакрада, які ужо не раз цалаваў сталёвы замок турмы ў Расеі за зладзейства і грабёж! Віншуем.

Чалавек, які піша пад псэўдон. Квас—нам тукака ведамы зладзейскі хуліган! Гэты псэўдонім ведае ў гміне нашай кожны хлапчук,—шкада зладзеям скрывацца за сьценкі Квасаў.

Па сьвеце.

Паводкі.

У РАСЕІ. У ваколіцах Арэнбургу вада заліла больш як дзесяць вёсак. Чугуначны насып папсуты на некалькі кілёмэтраў. Сібірскі цягнік, які ішоў з Уладзівастоку да Масквы прыстаў на дарозе бліска Сызрані.

ПАВОДКІ У АМЭРЫЦЫ. 29 м. красавіка каля Арлеяну, падняўшаяся ў Місісіпі вада разарвала плаціну і заліла ваколіцы.

Убыткі аблічаются на сотні мільёнаў. 450 тыс. акраў зямлі занята вадой. Больш як 200 000 жыхароў страціла сваю маемасьць. Лік людзкіх ахвяраў даходзіць 600.

Фэрмэры амэрыканскія з кулямётамі бароняць прарыў плаціны.

Каб вада не магла заліць места Новага Арлеяну, ўлады распарадзіліся ўзарваць запруду ў ваколіцы Пойдрас. Фэрмэры лікам да 10.000 уваружаныя кулямётамі, стрэльбамі і рэвальверамі спрацівіліся гэтаму распараджэньню. Ня гледзячы на гэта плаціна будзе ўзарвана.

Усячына.

Драбязы.

— У Злучаных Штатах паўстала цікавая палеміка: ці каталік можа быць прэзыдэнтам? Канстытуцыя гэтага не забараняе, але ўсе дасюлешнія прэзыдэнты былі пратэстантамі. Палеміка распачалася ў сувязі з замерам выбару Сміта, демакрата, які зьяўляецца каталіком.

— У цырку ў Нью-Джэрсэй тры сланы гэтак перапудзіліся мышы, якая неяк трапіла да іх клеткі, што паламалі краты і выбеглі на вуліцу. Было нескалькі нешчасьлівых выпадкаў.

— Лёндан меў у 1802 годзе 800,000 жыхароў, цяпер — блізу 8 мільёнаў, г. ё. столькі-скольki Нарвэгія і Данія разам.

Грушкі на вярбе.

Вядомы, былы прафэсар батанікі ў Кракаўскім унівэрсытэце, Ростафінскі зрабіў нязвычайнае схрышчываньне расьлін. Яму ўдалося штучна запыліць вярбу цьветам грушкі. Увесь час гэтая вярба хварэла і праз пару гадоў выдала плады-грушкі, праўда дробныя. Галінкі і лісьцё вярбы захавалі ранейшы від. Гэтак прыслоўе „грушкі на вярбе“ страціла сваё значэньне.

Як доўга жывуць цары.

Гісторыкі зрабіўшы дасочыны даўжыні жыцьця цароў Габсбурскага дома ў Аўстрыі знайшлі, што першыя 35 цароў з гэтага дому (пачынаючы ад 1237 года) жылі сярэдня 19 гадоў. Такі самы лік апошніх цароў, жыўшых сярэднім 53 з палавінай гады. Жыцьцё цароў стала болей небясьпечнае, дык вось якраз уздаўжылася.

Пабіў рэкорд на зладзейства.

У Браслаўлі даўно жыве француз Жозэф Вальсбэ які хваліцца тым, што за ўсё сваё жыцьцё ён зрабіў 2.000 кражаў. Цяпер ён судзіцца за 250 кражаў. На судзе ён прызнаўся, што адных толькі веласіпедаў украў 187. У Браславе няма ні воднаго ўрадоваго дома дзе-б Вальсбэ чаго-кольвек не сьцягнуў. Здарылася наваг і так, што ён у судзі сьцягнуў пальто, а у паліцэйскага веласіпэд.

Паштовая скрынка.

Бартошэвіч Трафім — вдазы будуць цадзены ў чарговым нумары „Беларускага Слова“.

Падпісчыку з Крулеўшчыны — відаць, што Вы можаце пісаць вершы. Прысылайце больш.

Юрэзічу і іншым—вестка аб тым, што можна ехаць да Кітаю ў армію Чанг-Со-Ліна зьяўляецца перша-апрэльскім жартам аднэй з Варшаўскіх газэт. Іншыя газэты прынялі гэта за чыстую манэту і перадрукавалі!

Гэрмановіч М — выдаць кніжкай Вашыя запіскі будзе вельмі многа каштаваць. Зрабіць ілюстрацыі каштуе таксама вельмі дорага. А попыт на кніжку будзе малы. Наагул абойдзецца гэтае Вам у некалькі сот злотых.

Літвін Д. Дунец Давід, Ціхановіч Уладзімер Осінец Нікіфар, Шкулева Павал, Пагуда Сьцяпан, Валынец Ал, Крыцкі Платон, Шымык Янка, Кот Арсень Крупіч Янка, Ляўкевіч Мікола— *пробныя нумары „Беларускага Слова“ высылаюцца.*

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. Выдавец. Т-ва АЛЬФА, Вільня Біскупья 12. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.